проза

Ніл Гілевіч



...няма сілы адарвацца ад гэтых цудоўных радкоў, якія самі просяцца на памяць, якія хочацца паўтараць і паўтараць уголас...

# Два эпізоды з жыцця Насьці Каранёвай

## Насьцін суд

На зазімку сорак трэцяга наступ савецкай арміі на ўсходняй Віцебшчыне спыніўся, і надоўга — аж да лета, гнаць немчуру далей не было сілаў: выдыхліся. Спыніўся фронт усяго за нейкіх шэсьць-сем вёрст ад Мурожніцы — роднай вёскі Насьці Каранёвай. Амаль усе мурожнінцы па загадзе нямецкіх уладаў падаліся тады ад лініі фронту ў бежанцы, у нямецкі тыл, туды, дзе не чутно кулямётных чэргаў, выбухаў снарадаў і мінаў і менш «шанцу» стаць ахвярамі крывавай калатнечы, калі яна тут усчнецца зноў. Падаліся хто куды. Некалькі сем'яў, у тым ліку і Насьціна, апынуліся ў Застадольлі — кіламетраў за дваццаць пяць ад Мурожніцы. Там і жылі аж да вызваленьня ў канцы чэрвеня сорак чацьвёртага. Там і засеялі вясной па кавалку зямлі — бульбай, ячменем, аўсом. Трэба ж было думаць пра тое, што будзем есьці, калі вернемся — дзе палеткі і агароды засталіся пуставаць.

Маці зайшла з вуліцы ў двор, убачыла за парканам у вішаньніку Насьцю з падвешаным на жываце збанком і няголасна, але патрабавальна аклікнула:

— Слухай сюды!

Насьця перастала шчыпаць вішні і хуценька падышла да паркану.

— Давядзецца табе, дачушка, ехаць у Застадольле, сёньня нанач... З Мырсам і Адэляй. Мяне Пурхала не адпускае і Ліпу не адпускае.

Чаго ехаць — Насьця здагадалася адразу ж, пра гэта ўжо ня раз усчыналася дома гаворка. У Застадольлі — загончык іхняга ячменю, які ўжо дасьпеў, і яго трэба зжаць і прывезьці ў снапах сюды, бо — есьці, апроч малака, няма чаго. Шчасьце, што засталася, ацалела кароўка, — выручае. А хлеба — толькі Міцькава пайка, адна на чатырох. Міцька — айчым, працуе ў горадзе на чыгунцы. Маці з большай дачкой Ліпай робяць у калгасе. Цяпер — прыпар, яшчэ не справіліся давяршыць сенакос, а ўжо і жніво заруліла, і старшыня Пурхала паставіў ультыматум сям'і чыгуначніка: ня будзеце штодзённа хадзіць на працу — ня дам накасіць карове і ахапка сена. Іншым ён так жорстка не дакляруе, тут прымяшалася яго асабістая непрыязнасьць да неасьцярожнага на язык Міцькі.

— Нажнеш снапоў пятнаццаць-дваццаць і хопіць, астатняе сажнецца пасьля. Трэба, каб цяпер было што ў жорны засыпаць — і на муку, і на крупы.

— А чаму нанач? — у голасе Насьці пачулася нотка расчараваньня.

— Мырса сказаў, што за дзень ня справіцеся. Ды і конь ня выдужае. Нічога страшнага, пераначуеце там, у Застадольлі. — Зразумеўшы, што Насьці мабыць, трохі боязна, усё ж толькі трынаццаць нядаўна мінула, дадала: — Ты нічога ня бойся, Адэлі трымайся, я гаварыла з ёй, яна цябе любіць і калі што — паможа. Мырса складзе ў воз і свае снапы, і Адэліны, і нашы.

— А Мырса сваё будзе сам жаць? — спытала Насьця. Яна ніколі ня бачыла, каб мужчыны жалі. Мужчынская работа — касіць, хадзіць за плугам, звозіць снапы з поля... Хаця — у апошнія гады, пад акупацыяй, многія жанчыны, чыіх мужыкоў забралі на вайну, і аралі, і касілі, і дровы з лесу вазілі, і ўсё іншае па гаспадарцы рабілі самі.

— Не, Мырсава сажне Адэля; за тое, што ён прывязе.

Насьця ведала: Мырса рабіў у калгасе конюхам, і Пурхала пайшоў яму пры пільнай патрэбе насустрач — даў каня. Мабыць, старшыня даражыў ці не адзіным нестарым мужыком у вёсцы.

Мырсу было гадоў пад сорак, але на вайну яго не ўзялі, бо трохі накульгваў. А яшчэ Насьця ведала, — у вёсцы ўсе ведаюць пра ўсё, падлеткі таксама, — што гэты Чыкільга, ці Чыкільгей, як яго дражнілі за кульгавасьць, ходзіць употайкі да аўдавелых маладых баб. На мове Міцькі — як яна аднойчы пачула — «пасецца». Праз гэта Мырса здаваўся Насьці асабліва брыдкім і нядобрым.

Адэля Падгэрцава стала ўдавой яшчэ ў першыя дні вайны, маладзіцай з двухгадовым сынам на руках. Яе чалавек загінуў, можна сказаць, выпадкова: пагнаў, па загадзе начальства, на ўсход статак кароў і трапіў на гравійцы пад нямецкую бамбёжку. Страту мужа яна перажыла цяжка, доўгі час раўла-выла і дома, і на могілках амаль штодня. Але маладосьць брала сваё, і жанчына патроху супакоілася, вядома ж, думала аб тым,

што наперадзе яшчэ амаль усё жыццё, ды і дзіця выгадаваць трэба, і было б шчасьцем, калі б які людскі чалавек напаткаўся. Але ж, каб менавіта людскі! Бо летам у сорак другім да яе доўга прыставаў п’яніца-паліцай Казік з суседніх Запольцаў, нават пагражаў расправай, але Адэля не збаялася і не паддалася, — па прыгаворцы: чымся гэткі, дык лепш ніякі. Што праўда, і пра нямецкіх паслугачоў яна думала вельмі нядобра. Яе старэйшы брат перад вайной закончыў лётнае вучылішча і ў званьні лейтэнанта паехаў служыць у Заходнюю Украіну, дык пэўна ж цяпер, калі жывы, недзе змагаецца з фашыстамі. А тут — іх паслугач чэпіцца! А як вернуцца нашы і яе брат, што будзе тады?

Пры немцах Адэля нічога дачакацца не магла: амаль усе маладыя мужчыны на вайне, а калі хто і застаўся дома — дык хіба ўхопіцца за ўдаву з дзіцем, калі столькі дзявок незамужніх? Хоць была яна, што праўда, і прыгожая з твару, і надта ж сабой прывабная — высакаваценькая, не павясковаму танклявая, зграбная ў паясьніцы. Вызваленьне з-пад акупацыі спадзеў Адэлі на людскага чалавека падразала яшчэ больш. У армію, на фронт, заграблі ўсіх чыста мужыкоў, у тым ліку і ўчарашніх партызанаў. Доля беларускай жанчыны пачала праясьняцца ўсё больш выразна — доля, якую інакш як праклятая і не назавеш.

Выехалі пазнавата, калі сонца ўжо добра пазначылася на адвячорак. У дарогу Насьці маці паклала ў торбу паўклінка сьвежага сыру, бутэльку малака, тры звараныя яйцы і кавалачак хлеба; а яшчэ — зношаныя, ужо ня раз ладжаныя сандалікі — каб не пакалоць ногі на ячнішчы; і вядома ж — серп, дбайна абкруціўшы яго старым чыстым рушніком.

Рыжая кабылка — падарунак калгасу ад армейцаў — здавалася занадта маленькай супроць доўгіх, з высокімі густымі драбінкамі, калёс. На донных дошках быў разасланы ладны ахапак сена, на якім і разьмясьціліся: сьпераду Мырса, за ім Адэля, ззаду Насьця. Адэля загадвала Насьці сесьці пасярод, але дзяўчына заўпарцілася і так паглядзела Адэлі ў вочы, што тая адступілася. Насьця хацела быць хоць трохі далей ад гэтага зарослага чорнай шчэцьцю, крыху вірлавокага «чыкільгея». А яшчэ — яна ведала, што ехаць можна толькі з гары, а пад гару трэба злазіць, і, седзячы ззаду, гэта рабіць зручней.

Патрэба зьлезьці надалася зусім хутка. І не пад гару, а на роўным. Тое, што ў Мырсы кожнае другое ці трэцяе слова брыдкае, у вёсцы ведалі ўсе. Гэтым разам ён і зусім сябе вызваліў ад стрыманьня. За кожным «Но пашла!» на кабылку сыпаліся такія пахабныя дадаткі, што Адэля нарэшце не стрывала.

— Да чаго ж ты распусьціў язык, Антон. Хоць бы дзіцяці пасаромеўся!..

— Ха, знайшла дзіця! — тут жа абсек заўвагу Мырса. — У гэтага дзіцяці скора за пазухай ня будзе месьціцца, вунь як ужо адтутуркваюцца! Нябось, ужо і на якога паўшабэлка зазіраецца.

Ня ведаючы, як бараніцца ад гэтага бруду, Насьця спрытна саскочыла з калёс і колькі секунд пастаяла, каб трохі адстаць і ісьці за падводай воддаль. Мырса, вядома, заўважыў гэта і наўмысна моцна шлеганаў кабылку вераўчанымі лейцамі. «Ну прабяжы, — падумаў пра Насьцю, — прабяжы, калі ты такая цаца. Ці бачыш, зялепуха — а ўжо столькі гонару!..»

І Насьця пабегла, не збаяўшыся, што адстане, бо бачыла — скора будзе зноў пад гару, дагоніць.

У Застадольле прыехалі ўжо на пачатку зьмярканьня. Як і планаваў Мырса, спыніліся ў двары яго даўняга знаёмага, нават далёкага сваяка па жонцы. Як бы ў ранейшыя часы — то не абышлося б бяз добрай выпіўкі, а цяпер, у гэтую першую па вызваленьні пару, наконт чаркі ў вёсцы было больш чым туга. Балазе, бутэльку зеленаватага «муту» захапіў з сабою Мырса, — не з пустымі ж рукамі заходзіць у хату дый яшчэ прасіцца на начлег. Ну, і то добра, усё ж прывіталіся, пару разоў дзынкнулі і «будзь-здароўкнулі». Ды доўга сядзець і не выпадала: зранку, ледзь абцярушыцца раса, трэба ісьці жаць.

— Я пакладу вас спаць у пуньцы, на сене, — сказаў гаспадар. — У хаце, выбачайце, няма дзе, бачыце, колькі міндрыцы: пяцёра — і ўсе яшчэ, можна сказаць, галапупцы, старэйшай дзевяць. Ды ў пуньцы і лепш будзе, у хаце душна. Дай, баба, ім пару рызавак — ці расьсьцяліць, ці накрыцца...

У пуньцы, а гэта была сапраўды ня пуня, а пунька — метры на чатыры ўшыркі, — стаяў моцны дух сьвежага мурожнага сена. Хаця яго было яшчэ няшмат — мабыць, толькі са свайго гумна, або наношанае ў посьцілках з узьлеску. Яно ляжала ў адной палавіне пунькі — ад сьцяны да сьцяны — і было яшчэ не зусім утоптанае, відаць, яшчэ не пасьпелі добра пагоцацца дзеці. Адну рызаўку Адэля кінула ў адзін куток — для Мырсы, дзьве — у другі куток, для сябе з Насьцяй, — і паслаць, і накрыцца.

— Кладзіцеся, а я падкіну кабылцы гэтага сянца сьвежанькага, ды і курну заадно, перад сном праведным...

Мырса ўзяў ахапак сена і выйшаў за вароты.

Насьця ўжо была хацела ўлегчыся каля сьцяны, яна любіла «куткі», але Адэля яе намер запыніла.

— Пачакай, ад сьцяны я лягу, а ты ляж скраю... Так трэба.

Чаму трэба іменна так, Насьця не зразумела, але ня будзе ж яна пярэчыць сталай жанчыне. Скраю дык скраю — такое бяды.

Калі дзяўчына ўжо нацягнула на сябе сваю палову посьцілкі, Адэля, паўседзячы, трохі нахілілася да яе і нейкім нязвыклым прыглушана-таямнічым голасам загаварыла:

— Насьця, што я цябе папрашу... Ты ўжо не малая і павінна разумець... Сказала — і запнулася, як бы прыслухалася, ці не вяртаецца Мырса. Насьця ў прадчуваньні чагось незвычайнага, насьцярожылася, ажно дыханьне сьцішыла.

— Ты, Насьцечка, калі ноччу пачуеш, што ён да мяне лезе, ты закрычы. Ну, як бы спрасоньня, абы што... Моцна закрычы... Ты зразумела?

Хоць ад першых словаў Адэлі "ты ўжо не малая" Насьця і чакала пачуць нешта з таго страшнавата-таемнага, што з нядаўняга часу пачало яе цікавіць ужо не зусім па-дзіцячы, але ўсё ж такой просьбы яна не чакала. «Як гэта... палезе? — ледзь вымавіла сабе ў думках і сьціснулася ад страху ў камяк. — Палезе і ... каб я пачала крычаць?..»

— Што ты маўчыш, Насьця? Ты зразумела?

— Баюся, — не адразу адказала ціхім здаўленым голасам Насьця.

— Чаго ты баішся?

— Ён... будзе біць мяне...

— Во прыдумала! Хай толькі паспрабуе хоць пальцам крануць! Ня бойся. Крычы на ўвесь голас. Як з прасоньня. Ты чула, як крычаць спрасоньня, калі што надта страшнае прысьніцца?

— Адзін раз чула. Ліпа крычала. Прысьніла, што немец прыставіў ёй у грудзі вінтоўку і ўжо зьбіраецца стрэліць... От страшна крычала! Усё адно як зусім нечалавечым голасам.

— Во гэтак і ты закрычы, Насьцечка. Як толькі пачуеш, што я адбіваюся — крычы, Насьцечка, крычы,— укладаючыся побач на старую рызаўку прасіла жанчына. — Ты ж ведаеш, што я ня з тых, не з гуляшчых...

Насьця маўчала. Яна была ў вялікай разгубленасьці. Нарэшце сказала, але зусім ня тое, што чакала Адэля. Зусім ня тое.

— Цётка Адэля, ён жа стары і вельмі брыдкі...

— Ну, вядома, брыдкі, — пагадзілася Адэля. І дадала: — А каб нават і ня брыдкі, нашто ён мне? У яго ёсьць сям'я, дзеці. Каб яшчэ жонка прыйшла ды пабіла мне вокны — як гэна з Радзькавіч Марусі Смаляковай?

Гісторыю пра Марусю і яе пабітыя вокны Насьця ведала. Пабіла іх жонка старшыні іхняга Мурожніцкага сельсавету, сям'я якога жыла ў Радзькавічах, адкуль ён і прыязджаў штораніцы на «лісапедзе» на службу. Як сказаў Міцька (Насьця і гэта пачула): «Што яна пагваздала ёй вокны! Трэба было галаву пагваздаць! А то вокны!..»

— Вось ты, Насьця, і будзеш сьведка, што я не Маруся, на чужых мужыкоў ня кваплюся. Хоць бы сабе і на гэтага Мырсу. Абыходжуся і бяз іх.

У гэтую хвіліну Насьця думала пра Адэлю з маліто́ўным замілаваньнем. За сьцяною пачулася дзяркатае адкашліваньне Мырсы.

— Ідзе, — паўшэптам сказала Адэля. — Я ўжо сплю, Насьцечка, я ўжо сплю!..

І сьцішылася — як бы сапраўды імгненна правалілася ў сон. Задыхала спакойным працяглым дыханьнем.

Скрыгнулі двойчы — туды-сюды — вароты. «Зайшоў», — зазначыла ў думках Насьця і ў негустым мораку ўбачыла чорную, як цень, яго постаць, што падалася на другі край сяннога насьцілу. Зашамацела сена, — мабыць, пачаў укладацца. Не дапускаючы думкі, што Адэля і Насьця ўжо сьпяць, досыць голасна прагаварыў:

— Па небу відаць, што дзянёк будзе дай божа — гарачэйшы, чым сёньня. Так што давядзецца папекчыся.

Вядома ж, чакаў, што Адэля нешта на гэта скажа, але яна не азвалася, і знаку не падала, што пачула. Не варухнулася і замёрла, як бы яе тут і зусім няма, Насьця.

— Трэба пастарацца, каб ужо апаўдні выехаць. Раней прыедзем, дык і дома яшчэ пасьпеем зрабіць чаго-нечага, — працягваў гутарыць з Адэляй Мырса. — Хоць чорт яе пераробіць тую работу.

Відаць, не задаволены маўчаньнем той, каму гэта гаварылася, спытаў:

— Ты чуеш, што я кажу, Адэля?

Адэля, не варухнуўшыся, паціснула Насьці плячо, — маўляў: я сплю і нічога ня чую, і ты таксама.

З паўхвіліны доўжылася цішыня. Насьця нават хітра спахмінулася — ад гэтай неспадзяванай пацешнай гульні ў сон.

— Ты што, ужо заснула, Адэля? — у голасе Мырсы пачулася і зьдзіўленьне, і расчараваньне разам.

Адэля яшчэ раз дакранулася рукой да Насьці: будзем маўчаць, мы ня чуем яго, мы сьпім.

На бяду, Насьця адчула, што ў узгалоўі ў яе малавата сена, — менш,

чым пад плячом, і галава трохі закінулася, ляжаць няёмка. «Пасьцелю» трэба, вядома, паправіць — узгалоўе зрабіць вышэйшым, але яна баялася паварушыцца: Мырса пачуе шамаценьне сухога сена і зразумее, што Адэля ня сьпіць. Або — яна ня сьпіць, і да яе загаворыць. І Насьця рашыла цярпець — толькі зусім нячутна падклала кулачок пад шчаку, каб вышэй было.

Мырса паварочаўся ў сваім логаве, паадкашліваўся і, было падобна, супакоіўся.

Моцна ўзрушаная просьбай-заданьнем Адэлі, Насьця ляжала з расплюшчанымі вачыма і глядзела туды, дзе ў шчыце пунькі была шырокая шчыліна, — відаць, выламаўся аполак, ці нават два. У праломе сьвяцілася паласа неба, усеяная дробным зорным пылам. Насьця слухала цішыню. Нейкія шэпты-шушуканьні па сене ўсё ж ішлі, і яна чула іх. Можа, юркаюць і шамацяць мышы? — падумала. Юрканьне мышэй у вясковай пуньцы — рэч звычайная. Няхай шамацяць. Насьця мышэй не баялася. А можа нават і ня мышы, а жучкі якія шаволяцца-поўзаюць — і гэта шапаценьне ад іх? Няхай! Абы не зашастала сена цяжка, абы яна не пачула, што гэта заварочаўся ён і зараз ссунецца з сена нагамі долу і пойдзе сюды, да Адэлі. Але ён не варочаўся.

Насьці, вядома ж, хацелася спаць, але яна трывала і заплюшчыць вочы баялася. «Як толькі заплюшчу — дык і засну... І не пачую, як Чыкільгей... І не закрычу... І Адэля пакрыўдзіцца... А чаму яна сама?... Яна ж можа сама закрычаць! — раптам прабліснула ў галаве справядлівая думка. — Ну, праўда! Як толькі ён ... дык няхай яна наробіць крыку сама! І я прачнуся, і таксама пачну крычаць... І тады? Што будзе тады? Ну, яму будзе сорамна. А што пасьля мне? Я ж буду пра ўсё ведаць. І што? Расказаць дома, што Мырса лез уначы да Адэлі? Ну, ня ўсім дома, а толькі Ліпе. Маме не раскажу — маме пра такое гаварыць не асьмелюся. А можа, не скажу і Ліпе.»

Думкі беглі, абганяючы адна другую, пераскоквалі, блыталіся і зноў вярталіся да галоўнага: «Няўжо ён зараз палезе? Ну, палезе... А калі я не закрычу? Прыкінуся, што сплю і ня чую?.. А калі і цётка Адэля не закрычыць?.. Як не закрычыць? Дык яна ж ... павінна закрычаць!» О, гэта яшчэ адзін нечаканы скок-паварот думкі ў беднай галаве дзеўчынёхі. «Павінна... Ну, а калі не закрычыць? Не закрычыць — і ўсё! І што тады? І я ўсё буду чуць?..» Ад незразумелага, ніколі раней не пэражыванага страху апынуцца ў такой прыгодзе Насьці стала не па сабе, і яна моцна сплюшчыла вочы і сьціснула зубы, у ёй ужо загадзя ўздымалася ўнутры брыдкасьць, імгненна нарастаў страх, і яна ня ведала, што рабіць. Вясковы падлетак, яна шмат чаго ўжо чула і ведала з таго, пра што проста, адкрыта, не саромячыся, гаварылі між сабой дарослыя жанчыны або старэйшыя, на выданьні, дзеўкі. І ў полі, кароў пасучы, і ў лузе парой сенакосу, калі яна падмяняла матку на сушцы сена, і зімовымі вечарамі на супрадках, ды і ці мала дзе можна было пачуць пра гэта самае — грахоўнае, патаемнае, саромнае. На зьдзіўленьне Насьці, расказвалася гэта звычайна не з асуджэньнем і не з агідай, а хутчэй наадварот — з разуменьнем і апраўданьнем, ці з вясёлай паблажлівасьцю, з жывым нязлосным гумарам. Насьця саромелася слухаць такое, адварочвалася, рабіла выгляд, што ня чуе, але — слухала, і вельмі ўважліва, і лавіла сябе на тым, што слухаць ей гэта цікава, нават вельмі цікава, і цікавасьць гэта ня тая, як да нейкай

дзіўнай прыгоды ці страшнага здарэньня з жыцьця пад акупацыяй, а зусім-зусім іншага кшталту, — тая цікавасьць, што за ўсе іншыя цікавасьці цікавей. Бо Насьці ўжо было трынаццаць, і ўжо зусім блізка была пара яе першых дзявочых таямніц і хваляваньняў. «Ціха! — перабіла сваё думаньне такім нявымаўленым загадам Насьця. — Ён устае! Здаецца, ён устае! Шастае сена!..» Сапраўды было добра чутно, як у кутку насупроць зашастала-зашамацела сена — Мырса або варочаецца, каб лепш улегчыся, або ўстае. Або ўстае... І тады...

Уся напружаная даастатку, Насьця замёрла. Каб лепш чуць і на другое вуха, на якім ляжала, яшчэ трохі вышэй, аж пад скронь, пасунула і паставіла старчма кулачок. «Мусіць, закрычу, мусіць, закрычу, калі толькі пачую... Закрычу...» — паўтарала сабе ў думках Насьця, зусім ня ўпэўненая, аднак, што сапраўды так зробіць. «А што закрычаць? Як закрычаць? Гэтак страшна, як Ліпа спрасоньня крычала? А калі гэтак не атрымаецца? І ён пазнае, што гэта ня ў сьне, што гэта сумысьля?..

Тым часам шастаньне сена спынілася. Мырса нешта ці то буркнуў сабе зусім ціха, ці то гэтак слаба адкашляўся — і сьцішыўся. Але — ні сапеньня, ні храпу, — значыць, ня сьпіць. Па-ранейшаму роўна, крыху ўзацяжку, дыхае побач Адэля. А ці сьпіць яна? Няўжо заснула? Можа, і заснула. Ужо ж багата прайшло часу. Можа, крануць яе ціхенька рукою — пацiснуць за плячо, як яна пацiскала? Калі ня сьпіць — адкажа такім жа чынам: маўляў, не хвалюйся, усё ў парадку, я яшчэ ня сплю. Гэта нават будзе цікава — такая нібыта гульня між імі — размова пацiскамі. Але ў наступную хвіліну Насьця спахапілася — спалохалася свайго памкненьня «загаварыць» змоўшчыцкай мовай з Адэляй. «А калі яна сапраўды заснула і на маё дакрананьне падумае, што гэта лезе Чыкільгей, і наробіць крыку?.. І сваім крыкам разбудзіць яго?.. Во будзе прыгода! Не, ня буду яе чапаць, калі сьпіць — хай спіць, а калі ня спіць — ну дык ён жа яшчэ ня лезе...»

Насьці стала спакайней і яна, ціхенька, бяз лішняга шамаценьня, падгарнула пад галаву трохі больш сена. Ад таго, што паварушыла яго, мацней паліўся духмяны водар дасьпелых траў і зёлак. Ляжаць стала зручней, і, можа, ад п'яньлівага духу і ад заспакаеньня, што нічога ня здарыцца, што страх быў дарэмны, вартаўніцу Адэлінай рэпутацыі пачало моцна хіліць у сон. Павекі ўжо амаль не расклейваліся. Праз сілу на нейкую секунду расплюшчыла вочы і ўбачыла ў гэным праломе ў шчыце ўсё тое ж неміглівае беласрэбнае сяйво зорнага пылу. «Там, — усплыло ў памяці ведамае з падручніка, — Млечны Шлях... А дзед Усьцім яго называе Гусіным, кажа, правільна трэба гаварыць Гусіны, бо гэтым шляхам ляцяць у вырай гусі... Хай будзе Гусіны. Як для мяне, дык яшчэ прыгажэй... Як яны хораша ляцяць — тыя дзікія гусі! І які тужлівы іх крык у небе! Такі тужлівы, што аж сэрцу балюча...»

І Насьця ўспомніла, як мінулай восеньню, калі выбіралі бульбу, яна пачула ў вышыні, у небе, крык гусей і ўбачыла іх доўгі роўны шнур — якраз жа над полем, і крыкнула сястры: "Ліпа, глянь!", і выбегла з разоры, і замахала ім рукой — як махаюць, ужо разьвітаўшыся, на ад'езд, гасьцям, ці сябрам, ці родным. «Во, гусям махае! — сувірнулася на яе маці. — Гэта ж людзі сьмяяцца будуць, дурацiна ты!» Але Насьцю матчына ўшчуваньне не пакрыўдзіла, яна проста не зьвярнула ўвагі, захопленая і лётам, і крыкам гэтых казачна прыгожых птушак. Яна стаяла босая на мяккай цёплай ральлі і глядзела, і глядзела, як аддаляецца гусіны вырай. Чаму

ёй так дорага было бачыць гэта, чаму так лёгка і вольна дыхалася, аж хацелася ўзьняцца як на крылах і ляцець усьлед — Насьця ні сабе і нікому не адказала б. Яна глядзела, аж пакуль ён зусім не растаў у далечыні, у перадвечаровай смузе верасьнёвага неба. Растаў, зьнік вырай — растаў, абарваўся і ўспамін пра яго. Насьця заснула.

І, можа б, ляцела яна ўсьлед за тым выраем доўга-доўга — да самай раніцы, спала б, як звычайна дома, моцным салодкім сном аж да пабудкі, калі б Адэліна просьба ня ўзрушыла ёй усю душу, і калі б яе нервы не былі нацягнутыя так, як струны на Міцькавай балалайцы. Міцька, зьбіраючыся патрэнькаць на сваёй старой, яшчэ жаніхоўскай пары, балалайцы, накручваў струны на калкі так туга, што аднойчы адна з іх ня вытрымала і з жаласным гукам пэкнула. І нягучнага, здушанага войканьня хапіла, каб Насьця прачнулася. Войканьне было нейкае дзіўнае — такога яна ніколі раней ня чула: ні то ад страшнага болю, ні то ад радасьці і захапленьня. Пачулася яно там, дзе спаў Мырса. Не адтаго, што адразу ўсё зразумела, а з інстынкту самааховы, машынальна, Насьця сунула руку да сьцяны — Адэлі не было, яе месца пуставала. І тут зноў — войканьне, недарэшты стрыманы крык. А тады — шумны, выразны шэпт: “Які ты... Які ты дужы!..” — з цяжкім выдыхам. Гэта быў крык-шэпт Адэлі. “А ты думала!” — задаволена прагудзеў Мырса.

Насьця і дыхаць перастала. Ляжала з адкрытым ротам, у якім раптам усё перасохла: і нёба, і язык, і пад языком. Толькі чула, як гулка тахкае ў грудзёх сэрца. «Абманшчыца!.. Абманшчыца!.. Як яна подла мяне падманула!.. З такім брыдкім «чыкільгеем»!..

Нейкі час там, у другім кутку, яшчэ чулася шумнае, як пасьля цяжкай зморы, дыханьне, затым яго заглушыла моцнае, зусім не асьцярожнае шамаценьне сена, і тут жа ціха скрыпнулі вароты. Праз хвіліну скрыпнулі зноў, і Насьця пачула, як сена зашамацела ў яе ў нагах, затым — побач, каля сьцяны, — Адэля вярталася на сваё лежышча. Улеглася, памаўчала, а тады — як бы спахапіўшыся, нягучна, але вымоўна пазвала:

— Насьця!.. Насьця, ты сьпіш?

Насьця зразумела: правярае на ўсякі выпадак. І праз сілу падаўляючы ў сабе крык агіды, расчараваньня, крыўды, прамаўчала. «Абманшчыца!.. Якая подлая абманшчыца!.. Усе абманшчыкі! Усе! Хітруюць, ілгуць, ашукваюць, чыняць паскудства, б’юць вокны... Нашто яна мне так хлусіла, нашто?..» У грудзёх сьціснулася, заныла. Адчула, як да воч падступаюць сьлёзы. Але, баючыся выдаць сябе, спазмы ў горле стрымала.

Раніцой яе разбудзіла Адэля — далікатным казытаньнем мяцёлачкай мятліцы пад носам. Насьця якую долю хвіліны крывіла губы, круціла галавой, а затым — моцна чыхнула і прахапілася. Задаволеная сваім «дзіцячым» фокусам, Адэля весела засьмяялася.

— Гэта ж я цябе так буджу, як мы, бывала, кароў пасучы, адно аднаго будзілі. Ну, ці выспалася? — у Адэлі быў відочна добры настрой.

— Выспалася, — ледзь чутна прагаварыла Насьця, не падымаючы вачэй.

— Ну, і я сваё ўзяла — напоўніцу. Нават ні разу не павярнулася за ноч. Аж самой ня верыцца... Хадзем перакусім — ды за работу.

І за сьняданьнем, і ў полі Адэля была вельмі ўважлівая да Насьці і ласкавая. Нават і дажаць дапамагла, і снапы зьнесьці да возу. І ўсё хва-

ліла-пахвальвала: «Якая ты спрытная ў рабоце! Ты, відаць, і за Ліпу лаўчэйшая.»

Але Насьця на размову не давалася,— альбо маўчала, альбо адказ месьціла ў адно слова. Адэля, хоць і была трохі асьлепленая глытком крадзенага бабскага шчасьця, усё ж заўважыла, што дзяўчыну як падмянілі.

— Мусіць ты ўсё-такі не даспала, Насьцечка? — спытала крыху заклапочана за полуднем.

— Даспала, — гэтак жа ціха, як і раніцой, адказала Насьця і гэтак жа сама ня гледзячы Адэлі ў вочы.

У дарогу рушылі пасьля паўдня. Насьця, з торбачкай у руцэ, пайшла за возам воддаль, — каб ня чуць, што яны — Мырса і Адэля — між сабой гавораць. На роўным ці дзе трохі з пагорка, залазілі на воз, вядома ж, прапаноўвалі кожны раз і Насьці. «Залазь, праедземся!» Але яна ўпарта кожны раз адмаўлялася.

— Не, я хачу прайсьціся, — адказвала.

— Ну, што ж, ногі маладыя, тупай! — не налягаў на запрашэньне праехацца Мырса.

Так Насьця і пратупала ўсю дарогу, аж да самага дому. У цяжкай паныласьці. З горкімі недзіцячымі думкамі. Абражаная. Пакрыўджаная. І — нашмат пасталелая.

*2002*

## Пушкін, педагог і “дзеравенская дура”

Як і бальшыня дзяцей вайны, што тры гады жылі пад нямецкай акупацыяй і вучыцца не маглі, Насьця Каранёва закончыла сёмы клас пераросткам: летам ёй стукнула сямнаццаць. Калісьці, у даўнія часы, у такім узросьце дзяўчат у беларускіх вёсках сваталі і бралі замуж, а цяпер... Зрэшты, раньнія птушачкі, што выпырхваюць на першую любоўную песьню, не перавяліся. Дый не перавядуцца ніколі. Але Насьця да такіх не належала, Насьця вельмі хацела вучыцца далей, вельмі! Ды і маці падтрымлівала гэтую яе хэнць. «Трэба, каб ты палучыла абразуваньня, каб твае маскоўскія цётухны не сьмяяліся з цябе, што не абчасаная.»

У Мурожніцы школа — сямігодка, бліжэйшая сярэдняя — у райцэнтры, значыць, давядзецца або езьдзіць туды, балазе, раніцай праходзіць поезд мясцовага прызначэньня, або — здымаць у мястэчку «куток». Было выбрана першае; каб жыць на кватэры і асобна ад сям'і сталавацца — на гэта патрэбны ладныя грошы, якіх, вядома ж, не было. Езьдзіць абыдзецца дзешавей, тым больш, што іншы раз удасца праехаць і «зайцам» — тады ў мурожнінцаў асабліва ў маладых, у падлеткаў, гэта было надта «ў модзе».

Так Насьця стала вучаніцай 8-га класу гарадской дзесяцігодкі. Горад ня горад, а ўсяго невялікі гарадок, і аднак жа ня вёска. Да новай школы яна прывыкала паступова, стрымлівала прыродная сарамлівасьць, але ўрэшце асвойталася і бліжай сышлася з новымі знаёмымі, а з некаторымі аднакласьніцамі і пасябравала. Асабліва — з чарнявай, мілавяснушчатай Верачкай — ціхмянай, сьціплай, без прэтэнзій на ўвагу і тым больш на

лідэрства ў дзявочай грамадзе, дзяўчынай, з якою яе ў першы дзень заняткаў, пры фарміраваньні класаў, пасадзілі побач за адною партай.

Найбольшай жа Насьцінай радасьцю ў гэту восень было тое, што яна дарвалася нарэшце да кніг. Рэч у тым, што старэйшая сястра Ліпа пачала працаваць сакратаром сельсавету, раззнаёмілася ў райцэнтры з «элітай» (у яе гэта атрымлівалася), а з загадчыцай бібліятэкі нават зблізілася і займела доступ да кніжных паліцаў. Пасьля шасьці гадоў кніжнага голаду (тры пад акупацыяй і тры пасьля вызваленьня: у вёску кніга трапляла рэдка) Насьця магла цяпер чытаць уволю — колькі хапала часу. У першую чаргу сястра забясьпечвала кнігамі пісьменьнікаў, якіх «праходзілі» па школьнай праграме. Гэта былі творы рускіх класікаў, якія друкаваліся тады ў друкарнях пад нумарам — бяз назвы і без указаньня месца. Дасьведчаныя ведалі: гэта значыць, на тэрыторыі савецкай зоны акупацыі Германіі (пераважна ў Лейпцыгу). Беларускія і ўсе савецкія кніжнікі тых часоў помняць, якія гэта былі ладныя, зграбныя, хораша прашытыя, туга спрасаваныя, аддрукаваныя на тонкай высакаякаснай паперы тамы, так непадобныя на пузатыя, рыхлыя, расхлябістыя кнігі айчыннага вырабу, якія праз ужо колькі месяцаў карыстаньня ператвараліся ў пахляпні.

Так у руках Насьці апынуўся і вялікі том выбраных твораў Пушкіна, які яна ў першы ж дзень гартала да позьняга вечару. Напэўна, гартала б і ўсю ноч, калі б ня звыклы ў іх хатнім рэжыме дыктат бацькоў — маці і айчыма. У хаце даўно панаваў сон, а невялікая карасінавая лямпка — з металёвым магазынам і шкляным камінком — усё гарэла на стале і гарэла. Лямпка яшчэ даваеннага вырабу, зьбераглася, ацалела за гады акупацыі, і ёю даражылі, бо ў суседзяў і такой не было — паслугоўваліся газовачкамі-капцілкамі. Пры патрэбе лямпку можна было павесіць і на сьцяне — для гэтага яна мела прымацаваную да магазына ручку з прарэзам, і тады падкручваўся вышэй кнот і давалася больш сьвятла — каб на ўвесь пакой. Але для адной чытачкі хапала і таго полымца, што нязырка сьвяцілася на стале, «пад носам». Ах, як цікава Насьці чытаць паэзію Пушкіна! Няма сілы адарвацца ад гэтых цудоўных радкоў, якія самі просяцца на памяць, якія хочацца паўтараць і паўтараць уголас. Пасьлязаўтра яна возьме гэты важкі том з сабой у школу — каб усе аднакласьнікі, а найперш настаўнік Самсон Самсонавіч, пабачылі, як яна любіць і вывучае літаратуру. Не па «аблізанай» хрэстаматыі, а па тоўстых кнігах «выбранага».

І раптам — з цёмнай другой палавіны хаты, праз прыадчыненыя дзьверы, — злосна-сварлівы голас маці:

— Колькі ты будзеш там сядзець? Поўнач на двары, а яна ўсё сьлепіцца! Гэта ж карасіну не набрацца!..

— Зараз, зараз кладуся! — азвалася тонам просьбы-мальбы Насьця. Але ж ня можа яна ў гэтую ж хвіліну згарнуць кнігу, калі дачыталася да самага цікавага: Тацяна піша пісьмо Анегіну! Ой, якая бедная Тацяна! Як яна закахалася ў гэнага «дэндзі» Анегіна! Аж рашыла прызнацца яму сама. Ды ня вусна, бо вусна — страшна, а пісьмом. Вусна і я, відаць, не змагу прызнацца ніколі. Ай, як цікава! Чым жа закончыць яна сваё прызнаньне?

Вся жизнь моя была залогом
Свиданья верного с тобой;

Я знаю: ты мне послан Богом,
До гроба ты хранитель мой...

І ў гэты момант Насьця адчула, што нехта набліжаецца да стала. Амаль спалохана падняла вочы і ўбачыла перад сабой айчыма. Трымаючы адной рукою — на жываце — зрэбныя споднікі, ён спрытна абапёрся другой рукой аб край стальніцы, нагнуўся над лямпкай і злосна хукнуў у камінок. Імгненна ўсё наўкол заліла чорная цемень. Нячутна, як і паявілася, прапала ў цемрачы і нехлямяжая, дробнай касьці, постаць айчыма.

— От ужо! — са злосьцю, але нягромка, выкрыкнула Насьця. Нават ня даў пісьмо дачытаць! Ну, што гэта за кара боская! Першы рух волі быў: пайду вазьму сярнічкі і запалю нанова! Але тут жа запыніла сваё парываньне. Успомніла: сям'я жыве на сьціплы заробак айчыма, дзяжурнага іх маленькай чыгуначнай станцыі. І карасіна купляецца за яго грошы. Насьця гэта выдатна разумее. Куды ж пярэчыць, куды пратэставаць? Трэба мірыцца і цярпець. «Заўтра дачытаю», — прашаптала сабе гаротніца. Пасядзела хвіліну моўчкі ды і пайшла ўпоцемку да свайго ложку.

У суботу Насьця прынесла таміну Пушкіна ў клас. Урок па рускай літаратуры быў у той дзень апошні, але Насьця яшчэ да пачатку заняткаў паклала кнігу на парту — хай глядзяць і зайздросцяць, і хай ня думаюць, што калі яна вясковая, дык яны, гарадчукі, могуць глядзець на яе звысоку. Ну, а каб і настаўнік абавязкова зьвярнуў увагу на яе стараннасьць і павышаную цікавасьць да літаратуры, гэтым разам — да паэзіі Пушкіна, Насьця асьмелілася ў самым пачатку ўроку, адразу ж пасьля праверкі прысутнасьці, падняць руку для пытаньня.

— Што ў цябе, Каранёва?

Насьця ўстала, трымаючы ў руках разгорнуты том класіка.

— Самсон Самсонавіч, а што такое «лобзанья»?

Самсон Самсонавіч крыху тузануўся ў плячах, адвесіў і без таго віслую губу і ўставіўся ў Насьцю вырачанымі вачыма.

— Што-што-о? — перапытаў ён, як бы не дачуўшы, і па інтанацыі ільга было зразумець, што ён ня так не дачуў, як зьдзівіўся з такога пытаньня сямнаццацігадовай дзяўчыны.

— Я прачытала вось тут, у Пушкіна: «И всеми тайнами лобзанья и дивной негой утомлю», — ужо чамусьці неяк нясьмела патлумачыла Насьця,

— Ня ведаеш, што такое «лабзаньне»? — яшчэ больш вырачыў вочы Самсон Самсонавіч. І, адкінуўшыся ўсім сваім масіўным тулавам на сьпінку крэсла, гучна, на ўвесь шырока разяўлены рот, зарагатаў:

— Гах-ха-ха-ха-ха!.. Гах-ха-ха-ха-ха!..

Аж сьлёзы з вачэй пасыпаліся.

Захахакалі і загыгыкалі ва ўнісон з Самсонам Самсонавічам і амаль усе ў класе. А нейкі дасьціпнік з «камчаткі» пад гэтае гыгыканьне нават пульнуў абразьлівую рэпліку — нягучна, але так, каб пачулі: «Во дура дзеравенская!». Самсон Самсонавіч на відочнае хуліганства не зрэагаваў. Насьця зьбянтэжылася, нават разгубілася. Аж гарачынёй у твар палыхнула, «Няўжо гэта нешта такое?.. Дык гэта ж Пушкін напісаў! Сам Пушкін!» Ногі нібы падагнуліся, і яна села на месца. Суседка па парце Верачка апусьціла як бы ад няёмкасьці галаву, крыху нахілілася да Насьці, скасавурыла ў спагадлівай усьмешцы цёмна-шэрыя вочкі і ціха буркнула:

— Ну, і пытаньне задала!

Яшчэ больш заліўшыся чырваньню, Насьця таксама крыху павярнула галаву да сяброўкі і, не падымаючы вачэй, амаль шэптам спытала:

— А ты — ведаеш?

— Канешне, — пачула ў адказ. — Гэта... гэта самае...

«Што — гэта самае? — яшчэ больш умлела Насьця. — Гэта самае?..» Адышоўшы ад рогату, Самсон Самсонавіч яхідна скрывіў шырокаротую фізіяномію і кіўнуў Мішку Паўхлебаву — самаму кавалерыстаму ў класе — і па гадах, і на выгляд — хлапцу.

— Паўхлебаў, растлумач Каранёвай, што такое «лабзаньне», ты гэта, па-мойму, добра ведаеш ня толькі тэарэтычна, а, так сказаць. І...

— Ня трэба? — раней, чым дасказаў свой досыціп Самсон Самсонавіч, досыць галасна кінула Насьця і паўтарыла, зусім згараючы ад сораму: — Ня трэба!

— Адставіць, Паўхлебаў! — па-вайсковаму скамандаваў Самсон Самсонавіч. Ты ёй гэта пасьля растлумачыш, а цяпер — ідзі-тка сюды і раскажы на памяць урывак з «Яўгенія Анегіна».

Упёршыся пальцамі абедзьвюх рук у скроні — так, каб ніхто ня ўбачыў, што ў яе ў вачох, — Насьця нейкі час сядзела нерухома. Глядзела на густа зьбітыя знаёмыя радкі любімага паэта, але яны чамусьці расплываліся, рабіліся большымі і як бы мяняліся месцамі. “Каб толькі мяне ня выклікаў... Каб толькі ня выклікаў...» — пульсавала несупынна думка.

Калі зазьвінеў званок, хуценька ўсунула том Пушкіна ў партфелік і першая выбегла з класу. Але на ганку яе дагнала і схапіла за руку Верачка.

— Пачакай!.. Не крыўдуй, але ты, канешне...

— Дура, канешне! Дзе ж мне да разумных дараўняцца...

— Можа, сходзім у кіно? — наўмысна паспрабавала адвесьці Насьцю ад перажытага канфузу Верачка..

— Не, сёньня мне не выпадае, — пакруціла галавой Насьця. — Трэба сьпяшацца дадому. Шчасьліва!

Сказала, ня глянуўшы на Верачку, і пайшла цераз вуліцу туды, дзе была пешаходная сьцежка да станцыі. Пайшла адна — сам-насам са сваёй несусьветнай ганьбай. Гэта ж трэба! Ня ведаць, што такое «лобзанья»! Усе ведаюць, усе хіхікаюць, а я... Ну, бо дура... Дзеравенская дура! А ён... Як ён рагатаў! Як ён брыдка рагатаў. Аж заходзіўся!.. І якая агідная ў яго гэна шасьціпалая лапа! Ніколі такой агіднай, як сёньня, яна мне не здавалася.

У Самсона Самсонавіча на правай руцэ было шэсьць пальцаў.

*2002*